**Новікаў С.Я.**

# МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС ЯК ЦЭНТР ЗАХАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ МЕМАРЫЯЛЬНАГА КОМПЛЕКСУ “ХАТЫНЬ”)

*Ключавыя словы:* вёска Хатынь, Лагойскі раён, карная акцыя, мемарыялізацыя, першая (другая) чарга, архітэктурна-скульптурная кампазіцыя, музей-помнік, мемарыяльны комплекс “Хатынь”.

80-годдзе хатынскай трагедыі, адзначанае на высокім дзяржаўным узроўні 22 сакавіка 2023 г., замацавала ў свядомасці беларускага грамадства думку пра тое, што дзеючы Мемарыяльны комплекс “Хатынь” – святыня нацыянальнай памяці беларускага народа. Трагедыя жыхароў маленькай вёскі Хатынь Лагойскага раёна з 149 жыхарамі рознага ўзросту, спаленых нацысцкімі захопнікамі і іх мясцовымі памагатымі разам з жылымі і гаспадарчымі збудаваннямі, была ўпершыню ўвекавечаная на рэспубліканскім узроўні ў канцы 1960-х гадоў. У заключны год восьмай пяцігодкі стваральнікі архітэктурна-скульптурнай кампазіцыі мемарыялу – архітэктары Ю.М. Градаў, В.П. Занковіч, Л.М. Левін і скульптар С.І. Селіханаў – былі адзначаны Ленінскай прэміяй.

У якасці афіцыйнага ў красавіку 1966 г. тагачаснымі партыйнымі і ўрадавымі рашэннямі ў рамках рэспубліканскай праграмы мемарыялізацыі месцу спаленай вёскі разам з яе жыхарамі быў нададзены статус “мемарыяльны комплекс музея-помніка” [1, с. 145]. Адкрыць яго планавалася да 50-годдзя Кампартыі БССР і ўтварэння Беларускай ССР, то бок да 1 студзеня 1969 г. Апроч таго, у адпаведнасці з пастановай ЦК КП Беларусі “Аб далейшай рабоце па ўвекавечанні гераічных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны” на месцы трагедыі павінен быць створаны філіял Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны і ўстаноўлены мемарыяльныя знакі [2, с. 148]. Як паведамляла рэспубліканская газета “Советская Белоруссия” 6 ліпеня 1969 г., па рашэнні Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і ўрада рэспублікі на месцы вёскі Хатынь быў збудаваны мемарыяльны комплекс [4, с. 171].

Звярнуцца да тэмы мемарыялізацыі аўтара гэтых радкоў як і шматлікіх чытачоў вымагае не столькі памятная дата, колькі адкрыццё новага музея. Сёння надзвычай важна паглядзець на Мемарыяльны комплекс “Хатынь” таксама і ў кантэксце працы, якую апошні час мэтанакіравана праводзіць Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь у рамках расследавання крымінальнай справы па фактах здзяйснення нацысцкімі злачынцамі і іх саўдзельнікамі генацыду мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны [3, с. 6]. Адным з папярэдніх вынікаў яе працы з’яўляецца ўдакладненне агульнай лічбы колькасці спаленых вёсак, больш вядомых для грамадскасці пад назвай “сёстры Хатыні”. У час памятных мерапрыемстваў у сувязі з 80-й гадавінай хатынскай трагедыі ў Мемарыяльным комплексе “Хатынь” 22 сакавіка 2023 г. упершыню была агучана новая лічба спаленых вёсак, якія раздзялілі лёс Хатынь. Цяпер гэтых вёсак стала на 30 больш у параўнанні з лічбай, што застаецца ўвекавечанй у архітэктурана-скульптурнай кампазіцыі “Спаленыя вёскі” на тэрыторыі Мемарыяльнага комплексу “Хатынь”. Апроч таго, сённяшні наведвальнік новай экспазіцыі музея атрымае іншую інфармацыю і адносна агульнай колькасці беларускіх вёсак, якія пацярпелі за часам нацысцкай акупацыі Беларусі. І гэта лічба значна перавышае тую, якая на ўваходзе сустракае кожнага наведвальніка на сімвалічным тыне былой вёскі Хатынь [5, с. 3].

Новы ўнікальны музей у Мемарыяльным комплексе “Хатынь” – што гэта ў кантэксце сучасных канцэпцый мемарыялізацыі і нацыянальнай культуры памяці? Або насамрэч гэта толькі чарговая музейная экспазіцыя на тэму вайны, якая стварае дадатковыя магчымасці для паглыблення ведаў аб генацыдзе мірнага насельніцтва Беларусі, або новая прастора для эмацыянальнага ўздзеяння на наведвальніка, які праз наглядныя і гукавыя эфекты адчуе на сабе боль і жах вайны, усвядоміць маштаб гора, якое прынесла нацысцкая акупацыя жыхарам толькі адной з беларускіх вёсак. Якую ролю выконваюць шэсць залаў музея, кожны з якіх вырашае сваю пазнавальную задачу, пагружаючы наведвальніка ў спалучэнне разрозненых, а не тэматычна знітаваных вобразаў, аб’ектаў, фактаў як гісторыі, так і памяці?

Чаму ж насамрэч служыць экспазіцыя першай залы “Дрэва гісторыі”, якая раскрывае гісторыю канфліктаў пачынаючы з X стагоддзя і даводзячы іх да асабліва крывавага XX стагоддзя, у той час як экскурсант мэтанакіравана прыехаў на месца трагедыі хатынцаў 22 сакавіка 1943 г. Другая зала “Пачатак вайны” пагружае наведвальніка ў атмасферу пачатку Вялікай Айчыннай вайны, але не паказвае пры гэтым рэлігійны, нацыянальны, прафесійны склад жыхароў вёскі Хатынь як напярэдадні, так і ў першыя дні ваеннага ліхалецця. Наступная зала “Акупацыя” раскрывае тэму акупацыі, лагераў смерці, масавых расстрэлаў і выжывання мірнага насельніцтва на захопленай тэрыторыі Беларусі, аднак пакідае экскурсантаў без гістарычных звестак аб саміх жыхарах вёскі Хатынь, іх колькасным удзеле ў Чырвонай арміі ці партызанскім руху, а галоўнае – не знаёміць наведвальніка са стратэгіямі выжывання жыхароў адной з мірных беларускіх вёсак. Чацвёртая зала “Спаленыя вёскі” прысвечаная вёскам, знішчаным за гады вайны ў ходзе шматлікіх карных акцый супраць мірнага насельніцтва. У цэнтры залы знаходзіцца карта Беларусі, дзе чырвонымі вугалькамі тлеюць 216 спаленых вёсак, якія раздзялілі лёс Хатыні: а ці даведаецца экскурсант аб трагедыі беларускіх вёсак у нацыянальным вымярэнні, ці ўбачыць колькасць “сясцёр Хатыні” у дачыненні да кожнага раёна і вобласці, ці даведаецца пра агульную лічбу тых, хто быў спалены разам са сваімі вёскамі? Пятая зала “Ідзі і глядзі” перадае тэму памяці, ўвасобленай у назвах населеных пунктаў, якія пацярпелі ад захопнікаў, аднак не прадстаўленых у колькасці людскіх ахвяр, панесеных у кожным з гэтых месцаў трагедыі беларускага народа, як не пачуе, не ўбачыць і не знойдзе адказу на пытанні аб агульнай колькасці мірнага насельніцтва, знішчанага за гады вайны на акупаванай тэрыторыі Лагойскага раёна, Мінскай вобласці, рэспублікі ў выніку правядзення карных акцый супраць партызан. Па кім званіць звон на белай столі, ці даведваецца наведвальнік у ходзе экскурсіі і ці разумее, што галоўнай застаецца памяць не толькі пра колькасць спаленых вёсак, разбураных ці пацярпелых збудаванняў, колькі пра маштабы людской трагедыі ў кожным з гэтых 216 месцаў. Заключная зала “Памяць” дэманструе асобныя гістарычныя рэлікты, якія не толькі перадаюць трагедыю вайны, але і служаць справе захавання памяці аб гісторыі стварэння мемарыяльнага ансамблю “Хатынь”, у той час як памяць пра хатынцаў адсоўваецца на задні план, асабліва ў вымярэнні асноўных сацыяльных груп самой вёскі, іх роду заняткаў, узросту, палавога складу, веравызнанняў, прафесійных інтарэсаў і інш. [6, с. 6–7]. Інакш кажучы, ці будзе ў новай музейнай экспазіцыі надалей служыць захаванню трывалай памяці ў розных груп наведвальнікаў стварэнне штучных, а не гістарычных вобразаў? І ў выніку ці не

прывядзе гэта да падмены памяці аб трагедыі хатынцаў памяццю толькі пра лічбавую статыстыку вайны.

У практычным плане перад кожным наведвальнікам Мемарыяльнага комплексу "Хатынь" стаіць вельмі няпростая задача: або пазнаёміцца з новай экспазіцыяй, адкрытай на ўваходзе ў комплекс, пасля чаго прайсці па прасторы памяці на гістарычным месцы спаленай вёскі Хатынь. Або аддаць перавагу адной з гэтых прастор памяці? Да ўсяго ў наведвальніка ўзнікаюць пытанні, сярод якіх галоўнае – як жа суадносяцца гэтыя прасторы памяці? Ці думалі стваральнікі новага музея аб важнасці спалучэння канцэпцый мемарыялізацыі новай экспазіцыі і існуючага месца памяці? Наколькі яны служаць галоўнай мэце – захаванню памяці пра ахвяр хатынскай трагедыі, увекавечанню кожнага з тых, хто загінуў у час карнай акцыі супраць мірных жыхароў вёскі Хатынь 22 сакавіка 1943 г.? Гэтыя і іншыя пытанні паўстаюць не толькі ў наведвальнікаў, але і экскурсаводаў. Адным з цэнтральных пытанняў тут нам бачыцца наступнае: ці стане новы музей "жывым сэрцам памяці" [7] у існуючай нацыянальнай святыні беларускага народа? Пошук адэкватных адказаў на пастаўленыя пытанні, прычым абгрунтаваных гістарычнымі дакументамі і практычным досведам, на сённяшні дзень адна з важных задач па захаванні памяці аб трагедыі беларускага народа ў гады вайны.

У якасці аднаго з варыянтаў такога адказу звернемся да вопыту мемарыялізацыі трагедыі спаленай вёскі Хатынь у канцы 1960-х гадоў. Мажліва назапашаны тады досвед можа дапамагчы наведвальніку вызначыць аснову надзвычай вялікага інтарэсу ў дачыненні да сусветна вядомага месца памяці пад назвай спаленай вёскі Хатынь, пераўтварыць гэтыя месцы ў новую прастору калектыўнай памяці і не будзе садзейнічаць яе трансфармацыі ў штучныя вобразы вайны?

Звернемся да філасофскай канцэпцыі памяці, замацаванай у архітэктурна-скульптурных вобразах на месцы спаленай вёскі Хатынь і побач з ёй. У якасці адказу працытуем адно з выказванняў архітэктара Л.М. Левіна. Шукаючыагульную ідэю стварэння кампазіцыі помніка, ён адзначаў: "Мы разам з Юрыем Градавым і Валяніцам Занковічам сядзелі і думалі, філасофствавалі, малявалі. Кожная ідэя прымалася і складвалася ў агульную скарбонку. Гэты працэс цяжка апісаць. Мы паставілі перад сабой задачу паказаць трагедыю беларускай вёскі, перанесці нашы адчуванні, пачуцці так, як гэта не было зроблена раней" [8]. Пры гэтым ведаючы гісторыю ўзнікнення гэтага месца памяці архітэктарамі агучвалася думка пра тое, што Хатыні магло і не быць [9, с. 32].

Разважаючы пра трагедыю Хатыні і хатынцаў, Л.М. Левін неаднаразова паўтараў, што адзін з галоўных успамінаў яго жыцця – асабістая сустрэча з Іосіфам Іосіфавічам Камінскім у Хатыні вясной 1967 г., калі ў памяці архітэктара пачаў складвацца вобраз пра трагедыю вёскі, яе жыхароў, кожнага хатынца. Менавіта тады была сфарміравана ідэя агульнай кампазіцыі – паказаць усю вёску, вуліцы, кожны дом, месца, дзе жыхары Хатыні былі спалена, і месца, дзе іх пахавалі. На думку Л.М, Левіна, вельмі важнай была ідэя зрубаў з комінамі. Ідэя не новая, але архітэктары ўбачылі яе па-іншаму, зрабілі падсечаную вертыкаль коміна, якая гаварыла, што дом быў знішчаны, спалены. Пра гэта казалі і расчыненыя веснічкі. Як вядома, у беларускіх вёсках людзі раней не закрывалі дамы, не вешалі замкоў, таму веснічкі расчынены… Але прыйшлі тыя, хто ўварваўся ў гэтыя дамы [8, с. 5].

Як успаміналі Ю.М. Градаў і Л.М. Левін, асаблівае хваляванне выклікала ідэя званоў на комінах, якія павінны былі "размаўляць" з кожным наведвальнікам, каб чалавек пачуў голас загінуўшых і голас сваёй душы. Паводле слоў Ю.М. Градава,

архітэктары шукалі альтэрнатыву званам, але на той час знайсці яе не змаглі [11]. Таму званы сталі тым сродкам, праз які ўдалося ажывіць Хатынь, стварыць яе гукавы вобраз, асабліва кранальны і памятны для кожнага наведвальніка.

Наступным важным аб'ектам помніка вёсцы Хатынь павінен быў стаць сімвалічны абпалены дах, які планавалася ўзняць на месцы гумна. Насупраць яго, на месцы брацкая магілы жыхароў Хатыні, сімвалічны Вянок памяці са словамі памяці. На адным баку белага мармуровага Вянку памяці былі змешчаны словы сімвалічнага звароту загінуўшых хатынцаў да нашчадкаў, на адваротным – адказ нашчадкаў хатынцам.

Як пісаў у аўтабіяграфічнай аповесці Л.М. Левін, скульптура старога з хлопчыкам на руках – гэты збіральны вобраз няскоранага чалавека, які ў намаляваных эскізах прыкметна розніўся з тым, што зрабіў скульптар С.І. Селіханаў. З пад яго рук Няскораны чалавек выйшаў крыху іншым, але ён выдатна перадаваў ідэю трагедыі, канцэптуальна замыкаў прастору трагедыі і памяці.

Адкрыццё мемарыяльнага ансамбля “Хатынь” адбылася 26 снежня 1968 г. напярэдадні 50-годдзя БССР. Тады ж першы намеснік старшыні Савета міністраў СССР К.Т. Мазураў прапанаваў надаць мемарыялу больш вобразнае гучанне – праз ідэю адной вёскі паказаць трагедыю ўсяго беларускага народа. Як лічыць Ю.М. Градаў, так у ансамблі, не парушаючы яго гармоніі, з'яўляюцца сімвалічныя могілкі беларускіх вёсак, вечны агонь з трыма бярозкамі ў памяць аб тых, хто загінуў у вайне [11]. Але галоўным у гэтай справе з'явіўся наўмысны адыход аўтараў ад агульнапрынятых на той час архітэктурных рашэнняў на карысць выкарыстання простай мовы архітэктуры і скульптурнай пластыкі ў перадачы гістарычных артэфактаў самой вёскі Хатынь. Як адзначаў Ю.М. Градаў, мы нічога не змянялі ў “помніку-дакуменце”. Прататыпам для скульптуры “Няскоранага чалавека” з паміраючым сынам на руках стаў Іосіф Камінскі, які цудам выжыў. Там, дзе праходзілі вясковыя вуліцы, захавалі дарожкі-падыходы, дзе стаялі 26 хат, паставілі вянцы зрубаў с пячнымі комінамі, дзе была адрына, у якой зажыва згарэлі жыхары вёскі, паставілі рухнуўшы дах. Проста прымусілі загаварыць кожны гістарычны элемент мовай блізкага і зразумелага ўсім наведвальнікам вобраза. Дах спецыяльна зрабілі масіўны, каб перадаць абрынутую на краіну бяду. Веснічкі пакінулі адкрытымі ў знак гасціннасці беларусаў. Пячныя вертыкалі завяршылі званамі [12, с. 266].

Л.М. Левін успамінаў, што аўтары адкрытага ў 1968 г. мемарыяльнага ансамбля “Хатынь” доўга думалі, перш чым вырашылі пачаць ствараць II чаргу мемарыяльнага комплексу. Узнікла ідэя зрабіць могілкі вёсак, спаленыя цалкам, якім паўтарылі трагічны лёс Хатыні. Апроч таго,нарадзілася ідэя 433 тых вёсак, якія былі знішчаны, аднак адрадзіліся пасля пажару вайны.

Архітэктары знайшлі ідэю паказаць наглядна бясконцую сцяну ахвяр, прысвечаную ахвярам месцаў масавага знішчэння мірнага насельніцтва і ваеннапалонных у Беларусі. Гэты вобраз быў выкананы ў выглядзе Сцяны Жалобы, Сцяны Памяці даўжынёй у 9800 см, дзе былі зроблены 66 ніш памяці аб дзіцячых лагерах смерці, лагерах смерці ваеннапалонных, месцах масавага знішчэння беларускіх грамадзян, вёсак, населеных пунктаў, гарадоў.

Аднак цэнтральнай у гэтым праекце была ідэя Вечнага агню Хатыні. На думку Л.М. Левіна, неабходна было ўспомніць кожнага чацвёртага жыхара Беларусі, які загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Архітэктары шукалі арыгінальнае рашэнне. Таму з'явілася ідэя паказаць гэта на чорнай пліце з чатырма адтулінамі. У трох з іх – будуць беларускія бярозкі, тры жыцця, якія

захаваліся нават ва ўмовах германскай акупацыі Беларусі. А ў чацвёртай, праз разарваныя краты, агонь – агонь Вечнай памяці, кожнаму чацвёртаму, які загінуў. Успамінаючы пра гэты момант, Л.М. Левін адзначае, што на этапе падрыхтоўкі П.М. Машэраў наведаў майстэрню, дзе яму першапачаткова быў прапанаваны макет традыцыйнага "Вечнага агню". Тагачасны Першы сакратар паглядзеў макет, паслухаў тлумачэнні, а потым сказаў;" Тое, што зрабілі вы, мог зрабіць і я. Не веру. Проста не веру, што ў вас няма арыгінальнага рашэння "Вечнага агню", "Вечнага агню Хатыні". І мы паказалі наш праект. Тры бярозкі і "Вечны агонь". Машэраў маўчаў. Усе прысутныя маўчалі. А потым Пётр Міронавіч сказаў: "Вось тое, што трэба. Тое, менавіта тое. Думаю, што вы знайшлі вобраз, які стане сімвалам Беларусі. Сімвалам нашых страт і нашага жыцця" [2, с. 8]. Так няпроста нараджалася ідэя вечнага агню Хатыні, які пасля яго адкрыцця стаў адным з сімвалаў трагедыі Беларусі, сімвалам страт і подзвігу беларускага народа. На думку Л.М. Левіна, "з завяршэннем тэмы "Вечнага агню" стварэнне ідэі мемарыяльнага комплексу "Хатынь", якая адлюстроўвала трагедыю беларускага народа, была цалкам завершана. Вечны агонь Хатыні стаў сімвалам трагедыі беларускага народа [8, с. 8].

На думку Л.М. Левіна, адкрыты летам 1969 г. мемарыяльны комплекс "Хатынь" стаў Народным Храмам Памяці. У ім удалося праз трагедыю Хатыні перадаць трагедыю ўсяго беларускага народа. Больш таго, у кожным архітэктурным вобразе ўвасоблены увесь той жах, той боль, тое гора беларускага народа, што прыйшлося яму перажыць на працягу трох гадоў германскай акупацыі Беларусі 1941–1944 гг.

Кажучы пра Хатынь, Л.М. Левін адзначае, што яна стала ўвасабляць Беларусь. Так, прэзідэнт ЗША Рычард Ніксан пасля візіту ў Мінск у 1974 годзе сказаў, што для яго Беларусь – гэта мемарыяльны комплекс "Хатынь", вакальны ансамбль "Песняры" і алімпійская чэмпіёнка па спартыўнай гімнастыцы Вольга Корбут [8, с. 8]. У сваім інтэрв'ю архітэктар зрабіў вельмі важную выснову аб тым, што калі гаварыць пра памяць, пра трагедыю беларускага народа, пра народнае гора, то менавіта ў Хатыні быў створаны своеасаблівы Дом памяці, які трымаецца на чатырох вуглах – Хатынь, Трасцянец, Курапаты і Яма. Знакаміты майстар перакананы, што неабходна захоўваць памяць пра трагедыю беларускага народа. І ў ёй Хатынь адлюстроўвае душу нашага народа, будзе заставацца Храмам, беларускім храмам памяці пад акрытым небам, Народным Храмам Памяці.

Сярод архітэктурных рашэнняў, вядомых у той час, згадваўся і "Музей зверстваў фашызму". Як успамінаў В.П. Занковіч, дзе быць гэтаму музею як не ў Хатыні. На яго думку, па замыслу Музей сустракае ўсіх, хто прыехаў у Хатынь пакланіцца ахвярам нацызму, і праводзіць усіх з воклічам – ПОМНІ!!! Менавіта таму важна яго размясціць пры ўваходзе у ансамбль і пры выхадзе з яго. І менавіта дах адрыны, у якой спальвалі хатынцаў, павінен уздыбіцца над "Музеем зверстваў фашызму" як клічнік з зваротам да ўсяго чалавецтва: "Не! Не! Не!" [13, с. 269].

Пастаўленыя вясной гэтага году пытанні чакаюць сваіх адказаў. Калі разглядаць памяць як мадэль сённяшняга жыцця, як пра гэта пісаў французскі даследчык П'ер Нара яшчэ ў мінулым стагоддзі, тады яе носьбітамі павінны выступаць людзі, якія не дазволяць ёй растварыцца ў прасторы гісторыі і захаваюць гістарычную памяць пра Вялікую Айчынную вайну ў сучасным і будучых пакаленнях.

1. Письмо Минского облисполкома в Совет Министров БССР о строительстве мемориального музея-памятника в д. Хатынь, 11 апреля 1966 г. // Хатынь. Трагедия и память. Документы и материалы / сост. : В. И. Адамушко [и др.].– Минск: НАРБ, 2009. – С. 139.

2. Из письма Минского облисполкома в Совет Министров БССР о ходе строительства Кургана Славы и филиала Белорусского государственного музея Великой Отечественной войны и мемориального памятника в д. Хатынь Логойского района, 23 октября 1968 г. // Хатынь. Трагедия и память. Документы и материалы / сост. : В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2009. – С. 148.
3. Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people : информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общей редакцией А.И. Шведа. – Минск: Беларусь, 2022. – 175 с.
4. Репортах в газете «Советская Белоруссия» «Хатынь никогда не повторится» об открытии мемориального комплекса «Хатынь» // Хатынь. Трагедия и память. Документы и материалы / сост. : В. И. Адамушко [и др.].– Минск : НАРБ, 2009. – С. 171–179.
5. Кононович, Е. «Если голову в руках будем держать, будет все нормально» / Е. Кононович, Д. Умпирович // СБ. – 23 марта 2023. – С. 3–5.
6. Горбатенко, И. Чтобы сердце рвало / И. Горбатенко // СБ. – 23 марта 2023. – С. 6–7.
7. Нора, П. Проблематика мест памяти / П. Нора [Электронныйресурс]. – Режим доступа: https://mipt.ru/education/chair/philosophy/upload/6ec/nora1-arph7asf0ow.pdf. – Дата доступа: 09.09.2023.
8. Левин, Л. М. Хатынь: автобиограф. повесть / Л. Левин. – Минск: Асобны Дах, 2005. – 280 с.
9. Народны Храм Памяці. Інтэрв'ю намесніка галоўнага рэдактара "Беларускага гістарычнага часопіса" Максіма Гальпяровіча з архітэктарам Леанідам Мендэлевічам Левіным // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. –№ 7. – С. 3–9.
10. Левин, Л. «Хатыни могло не быть» / Л. Левин // Женскпй журнал. – 2009. –№ 5. – С. 32–35.
11. Градов, Ю. М. Память в камне [Электронный ресурс] / Ю. М. Градов. – 2018. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/pamyat-v-kamne.html. – Дата доступа: 09.09.2023.
12. Из интервью с Ю.М. Градовым от 21 марта 2019 г. // Хатынская трагедия. Документы и материалы / сост.: В.Д. Селеменев (рук.) [и др.].; редкол.: А. К. Демянюк [и др.]. – Минск: Издатель Р. М. Цымберов, 2023. – С. 266–267.
13. Из воспоминаний В. П. Занковича // Хатынская трагедия. Документы и материалы / сост.: В.Д. Селеменев (рук.) [и др.]. ; редкол.: А. К. Демянюк [и др.]. – Минск : Издатель Р. М. Цымберов, 2023. – С. 267–269.

**Олейникова В.П.**

# ТРАДИЦИОННЫЕ МОДЕЛИ СОХРАНЕНИЯ КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ РЕГИОНА КАМПАНИЯ (ИТАЛИЯ) И ПОИСКИ НОВЫХ ФОРМ

*Ключевые слова:* Италия, Кампания, Неаполь, историко-культурное наследие, Всемирное наследие ЮНЕСКО.

По состоянию на 2018 год в Италии находилось 60 объектов Всемирного наследия ЮНЕСКО [1, р. 3–4]. 40 кандидатов числились на попадание в этот важный список [2]. Это – более 5% от общего количества объектов в мире.

Значительная часть из вышеперечисленных объектов расположена в регионе Кампания, что вполне объяснимо: этот район был заселен с древнейших времен, и на протяжении тысячелетий на этой земле оставили свой след различные культурные и художественные традиции. Достаточно сказать, что крупнейший город Юга Италии – Неаполь – имел решающее значение для греческой, итальянской и, вообще, европейской истории с момента своего основания, ибо на протяжении веков этот великий мегаполис периодически оказывался под властью различных европейских властителей.

Одаренное местное население не только развивалось под влиянием умений и навыков «пришельцев», но и вдохновлялось своей богатейшей природой. Роскошная натура Юга вдохновляла на творческий взлет, как титулованные слои общества, так и простой народ. Достаточно отметить, что сегодня охраняемые природные локации Кампании занимают территории, занимающие 25% от всей поверхности региона [3], и, в основном, покрывают горные местности или холмистые равнины, за редкими исключениями, такими как долины Селе и Вольтурно.

Творческий взлет детей Юга выразился в том, что в Неаполе веками процветали разнообразные оригинальныеремесла: обработка кораллов, инкруста-